Упраўленне па адукацыі, спорце і турызме
Валожынскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Яршэвіцкі навучальна-педагагічны комплекс  дзіцячы сад – сярэдняя школа”

# “Мая Беларусь”

## Занятак па адукацыйнай вобласці “Дзіця і грамадства”

Пятроўская К.А.,
выхавальнік дашкольнай адукацыі

Яршэвічы, 2022

Мая Беларусь

Занятак па адукацыйнай вобласці “Дзіця і грамадства”

Праграмныя задачы:

сярэдняя падгрупа: фарміраваць уяўленне аб размяшчэнні Рэспублікі Беларусь, дзяржаўных сімвалах (сцяг, герб, гімн); людзях, якія праславілі Беларусь; аб сталіцы нашай радзімы-Мінск; развіваць духоўна-маральныя, патрыятычныя якасці асобы дзіцяці; выхоўваць эмацыйна пазітыўнае стаўленне да Радзімы;

старэйшая падгрупа: развіваць цікавасць і павагу да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь (сцяг, герб, гімн). Фарміраваць уяўленне аб прыродных сімвалах Беларусі (хвоя, зубр, бусел, кветка васілька, лён, канюшына); людзях, якія праславілі Беларусь, і іх дзейнасць. Развіваць духоўна-маральныя, патрыятычныя якасці асобы дзіцяці. Выхоўваць культуру талерантнасці.

Матэрыялы і абсталяванне: карта Рэспублікі Беларусь, малюнкі з выявамі прадметаў па тэме, ліст паперы, клей.

Ход занятку:

Выхавальнік (В): Дзеці, давайце павітаемся.

Дзеці (Дз): (у крузе) Сонейка устала. Раніца настала. Мы ўсе сабраліся. За рукі ўзяліся. Павіталіся.

В: Добрай раніцы! Шчыра ўсіх вітаем і здароўя жадаем.

Дз: Добрай раніцы, мы кажам Вам. Вельмі рады мы гасцям.

В: Мне сёння на тэлефон прыйшло гукавое паведамленне. Вось паслухайце якое. (Слухаем паведамленне).

Гэта паведамленне адправіла мая сяброўка Эн. Яна жыве ў Вялікабрытаніі. Шмат чула пра Беларусь. Хоча даведацца лепш пра нашу краіну і просіць расказаць як мага больш цікавага пра яе. Дапамажыце, калі ласка, мне скласці аповед пра Беларусь для Эн.

*Дзеці прапануюць сваю дапамогу.*

В. Толькі як гэта зрабіць? Можа напісаць ліст ? Але беларускую мову Эн не ведае і не ўмее чытаць па-беларуску. Што ж можна прыдумаць?

Дз: Напісаць ліст і перакласці яго на англіскую мову, падарыць энцыклапедыю пра Беларусь, намаляваць малюнак.

В. Я таксама спачатку хацела намаляваць малюнак, але потым падумала, які ж па памеры павінен быць гэты малюнак, каб на ім было адлюстравана ўсё-ўсё пра Беларусь! Тады я ўспомніла пра інтэлект-карты. З дапамогай карты можна расказаць шмат інфармацыі. Давайце разам з Вамі складзем інтэлект-карту пра нашу Радзіму для Эн.

*Выхавальнік на цэнтры ватмана клеіць контур карты Беларусі.*

В: Што мы ведаем пра Беларусь?

Дз: Ведаем, што сталіца нашай Радзімы – горад Мінск.

Верш Э. Агняцвет “Наш Мінск”

Ты прасторны, чысты,
Горад наш герой,
Свеціш прамяніста
Зоркай залатой.

Кожнаму кварталу
Аддаём салют!
Любім дом Купалы —
Ціхі, родны кут.

Светлыя дарогі
Нас вядуць далей.
Плошча Перамогі
Слухае дзяцей:

Мы, як птушаняты,
Любім неба шыр,
Дзякуем салдатам
За жыццё і мір!

В: Мінск-самы вялікі і галоўны горад нашай краіны. Мінск з’яўляецца сталіцай Рэспублікі Беларусь, таму тут працуюць Прызідэнт і Урад краіны.

*Дзеці прыклеіваюць на карту Мінск.*

В: Пра што яшчэ мы раскажам ?

Дз: Сімвалы дзяржавы (герб, флаг, гімн).

В: Герб з’яўляецца эмблемай нашай дзяржавы. Як Вы думаеце, дзе звычайна сустракаецца выява герба*? (На дзяржаўных будынках, пячатках, пашпартах, грашовых знаках, дакументах).* Што алюстравана на нашым гербе? (*Прамяні сонца, кветкі канюшыны,каласы, лён і г.д.).*

А можа вы ведаеце, што гэта азначае? (*Вянок з каласоў – знак памяці і сувязі с продкамі, сімвал ураджаю і росквіту. Канюшына – сімвал сувязі са светам жывёл. Лён – гэта дабро, дастатак, праца.Зямны шар– сімвал сяброўства і партнёрства. Пяцікантовая зорка – сімвал чалавечнасці і мужнасці).*

В: А зараз паглядзіце, які прыгожы сцяг у нашай краіны. Наш сцяг мае тры колеры: чырвоны, зялёны і белы. *( Чырвоны колер са старажытных часоў служыць знакам Сонца, сімвалізуе кроўныя сувязі, братэрства, барацьбу за справядлівую справу.Зялёны колер – колер дабра – гэта перш за ўсё колер свабоды. Разам з тым белы колер – гэта колер маральнай чысціні і мудрасці).* Сцяг Беларусі мае яшчэ адну важную характэрную дэталь – гэта чырвоны народны ўзор, ці інакш кажучы, арнамент. Арнамент – сімвалічны малюнак, графічны спосаб заклінання вышэйшых боскіх сіл. Праз узоры ці арнамент, людзі выказвалі розныя пажаданні і запаветы яшчэ ў тыя часы, калі не існавала пісьменства.

Калі гучыць Дзяржаўны гімн? (*Падчас пад'ёму Дзяржаўнага сцяга, у час нацыянальных свят, пры ўручэнні ўзнагарод спарсменам).*

Н.Гальпяровіч "Сімвалы маёй краіны"
Калі на наш гляджу я сцяг
То бачу ўвесь свой родны край:
Палёў квітнеючы абсяг,
І веліч дрэў, і птушак грай.
Мы маем сцяг, і гімн, і герб.
Мы імі ганарымся тут!
Яны здабыты ў барацьбе
За незалежны родны кут.
Краіны сімвалы сваёй
Я беражна з сабой бяру.
І хай лунае над зямлёй
Імя святое – Беларусь!

В: А чым яшчэ славіцца наша краіна, мы даведаемся, адгадаўшы загадкі.

1. Я засяваю дол ігліцай, спрадвеку слаўлюся жывіцай. (Сасна.)
2. Гэты дзікі звер падобны на быка, але буйнейшы і мацнейшы; у яго ёсць барада . (Зубр.)
3. Хто ў чырвоных ботах ходзіць па балотах? (Бусел.)
4. Сінявокая кветка ў полі расце. Падабаецца дзеткам і радасць нясе. (Васілёк.)
5. Сінявокі слаўны чысты, галавісты залацісты, дасць абноў ён людзям шмат, будзе кожны вельмі рад.(Лён.)

В: Правільна адгадалі ўсе загадкі. Адным словам гэта – прыродныя сімвалы Беларусі, расліны і жывёлы, якімі багатая наша краіна (сасна, бусел, лён, васілёк, зубр).

***Фізхвілінка "Бусел"***

На страсе прачнуўся бусел *(далонькі на твар, потым адымаем).* Доўгай шыяй пацягнуўся *(цягнемся галавой, носікамі дагары).* Распрастаў шырока крылы *(разводзім рукі ў розныя бакі.)* Пёркі ветрам закруціла *(круцім далонямі, пальчыкамі).* А на двор бяжыць сабачка *(тупаем ножкамі, рукамі дапамагаем бегчы).* Круціць хвосцікам там качка *(круцім попамі, распрацоўваем пазваночнік, талію,суставы).* І выходзіць – рукі ў бокі – гаспадар да іх высокі *(паважна выступаем, рукі ўбокі, спіна раскрытая, роўная, галава высока паднятая).*

Дз: Яшчэ наша краіна славіцца беларускімі народнымі рамёствамі (ганчарствам, ткацтвам, саломапляценнем, разьбой па дрэве).

В: Адным з самых старажытных народных рамёстваў беларусаў з'яўляецца ганчарная справа. З якога матэрыялу ганчар стварае свае вырабы?

(*З гліны).* Назавіце прадметы якія рабілі ганчары з гліны? (*Гліняны посуд-міскі кубкі, гарлачы;гліняныя цацкі-птушачкі-свістулькі,рыбкі).*

Хатнім заняткам жанчын было ткацтва. З дапамогай чаго ткалі жанчыны? (*З дапамогай ткацкага станка).*Ткачыхі ткалі ручнікі, сурвэткі, паясы, абрусы і кашулі. З якога прыроднага матэрыялу выраблялі свае вырабы ткачыхі? *(З лёну).*

В: У нашай краіне многа прадпрыемстваў на якіх выпускаецца адзенне, абутак, бытавая тэхніка.

Гульня “Мазайка”

*Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на падгрупы. Кожнай падгрупе даецца канверт, у якім знаходзяцца разрэзаныя выявы прадпрыемстваў.*

В: На беларускай зямлі жылі людзі, якія сваімі добрымі справамі ўславілі не толькі сябе, але і нашу Беларусь, іх ведаюць ва ўсім свеце. Якіх знакамітых людзей Беларусі вы ведаеце? (*Еўфрасіння Полацкая, Францыск Скарына – асветнікі; касманаўты – Пётр Клімук, Уладзімір Кавалёнак; спартсмены – Дар’я Домрачава, Максім Мірны,Вікторыя Азаранка, Ала Цупер, Антон Кушнір і інш.)*

Гульня “Што робіць спартсмен?”

Біятланісты – *бягуць на лыжах, страляюць у мішэнь з вінтоўкі*; Байдарачнікі – *плаваюць на байдарках*; баксёры – *займаюцца боксам*; канькабежцы – *бегаюць на коньках*; плаўцы – *плаваюць*; футбалісты – *гуляюць у футбол*; фрыстайлісты – *выконваюць скачкі на лыжах*; хакеісты – *гуляюць у хакей.*

В: Што азначае слова “прырода”? (*Гэта ўсё, што не створана рукамі чалавека: жывёлы, сонца, вада, расліны, пветра, птушкі)* .Прырода бывае… (*Жывая і нежывая).* Вецер, снег, камень – гэта…(*нежывая прырода*), кветкі, жывёлы, насякомыя – гэта..(*жывая прырода*).

Гульня “Што лішняе?”

1. Голуб, сабака, *снег,*жук.
2. Гваздзікі, *гром,*карова, яблыня.
3. Вецер, додж, вугаль, *заяц.*
4. Нафта, навальніца, *званочак,* пясок.

В.Чалавек для свайго жыцця і дзейнасці выкарыстоўвае матэрыялы жывой і нежывой прыроды. Яны называюцца прыроднымі рэсурсамі. Якімі прыроднымі рэсурсамі славіцца наша краіна? (*Нафта,вугаль, прыродны газ, калійныя удабрэнні і інш.).*

Малайцы! Вы добра дапамглі мне, мы можам адправіць нашу карту маёй сяброўцы.

Паглядзіце, якая прыгожая атрымалася наша краіна. Мне хочацца яшчэ раз нагадаць вам : любіце і шануйце сваю краіну, сваю родную зямлю!

Вы шануйце свой край, родны край, беларусы!
Беражыце лясы, каб зямля не хварэла,
Каб цвілі верасы, каб Айчына квітнела!

*Я жадаю вам вырасці дастойнымі людзьмі, любіць і берагчы свой родны* куток – нашу Беларусь. *Я* спадзяюся, што ў вас гэта атрымаецца!

Я нарадзіўся Беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную клянуся,
Шанаваць, любіць, цаніць.

Сваю родную старонку,
Я люблю, як і бацькоў,
Што вучылі песні звонкай:
Прывівалі мне любоў

І да мовы, да дубровы,
Да палёў, і да лугоў,
І заўсёды да народа,
Што жыве тут ад вякоў.

Я клянуся, не зракуся
Сваё роднае любіць.
Быў і буду Беларусам,
Пакуль толькі буду жыць!

В. Вы, маленькія беларусы, можаце зрабіць нашу краіну дужай і магутнай, калі будзеце любіць сваіх сяброў, сваіх блізкіх і сваю Радзіму. Давайце возмемся за рукі і дружна скажам: “Калі дружба моцная, будзе Радзіма магутная”